# ГРОДЗЕНСКІ УНІВЕРСІТЭТ

ГАЗЕТА КАЛЕКТЫВУ ГРОДЗЕНСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ Я. КУПАЛЫ

№ 27 (182) 10 снежня 1991 года


## ПАЧЫНЧУК ПЁТР ІВАНАВІЧ



Заўчасна скончылася жыццё Пачынчука Пятра Іванавіча — старшага выкладчыка кафедры тэорыі і методыкі фізічнай культуры Гродзенскага дзяржаўнага універсітэта імя Я. Купалы, чалавека, поўнага творчых і фізічных сіл, майстра спорту міжнароднага класа, сярэбранага прызёра Маскоўскай Алімпіяды па лёгкай атлетыцы.

**П. І. Пачынчук** нарадзіўся ў вёсцы Ляхаўцы Маларыцкага раёна Брэсцкай вобласці ў 1954 годзе. У 1972 годзе паступіў у Гродзенскі дзяржуніверсітэт на гісторыка-педагагічны факультэт, які паспяхова скончыў у 1977 годзе. Сваю прафесіянальна-педагагічную падрыхтоўку павысіў у Вышэйшай школе трэнераў пры дзяржаўным Цэнтральным інстытуце фізічнай культуры.

На працягу многіх гадоў П. І. Пачынчук быў вядучым лёгкаатлетам рэспублікі і краіны, рэкардсменам свету ў складанейшым відзе лёгкай атлетыкі — спартыўнай хадзьбе.

За высокія спартыўныя паказчыкі ён быў узнагароджаны медалём «За трудовую доблесть» і Граматай Вярхоўнага Савета БССР.

Мы ведалі Пятра Іванавіча як жыццярадаснага, добразычлівага чалавека, надзейнага таварыша і сябра.

Светлая памяць аб Пятру Іванавічу Пачынчуку назаўсёды захаваецца ў нашых сэрцах.

**Група таварышаў.**

*Да ўвагі студэнтаў*

## ДЗЯРЖКАМІТЭТ СССР ПА НАРОДНАЙ АДУКАЦЫІ ПАВЕДАМЛЯЕ

**Паважаныя студэнты! Матэрыял з такой назвай быў надрукаваны ў нашай газеце 19 сакавіка гэтага года. Але па прычыне няведання альбо па іншых прычынах у вучэбны аддзел чамусьці мала звяртаецца дзяцей-сірат, якія засталіся без апекі бацькоў, за дапамогай. Таму сёння мы друкуем вытрымкі з матэрыяла, каб яшчэ раз напомніць гэтым студэнтам, што вучэбны аддзел можа аказаць матэрыяльную і іншую дапамогу.**

**Матэрыяльнае забеспячэнне і льготы для студэнтаў і навучэнцаў, якія знаходзяцца на поўным дзяржаўным забеспячэнні.**

Студэнты вышэйшых і навучэнцы сярэдніх спецыяльных навучальных установ з ліку дзяцей-сірат і дзяцей, якія засталіся без апекі бацькоў (з ліку былых выхаванцаў інтэрнатных установ) пры паступленні ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы залічваюцца на поўнае дзяржаўнае забеспячэнне.

Акрамя таго, на поўнае дзяржаўнае забеспячэнне могуць залічвацца непаўналетнія студэнты і навучэнцы, што страцілі бацькоў у час вучобы ў навучальнай установе, над якімі не ўстаноўлена апека.

Указаныя асобы ў перыяд навучання забяспечваюцца харчаваннем па нормах (без уліку тарговай нацэнкі). 1 руб. 89 кап. (у РэсрубліцыБеларусь).

У летні аздараўленчы перыяд (да 90 дзён), у выхадныя, святочныя і канікулярныя дні норма расходаў на харчаванне павялічваецца з разліку 20 кап. у дзень на кожнага чалавека.

Інагароднім навучэнцам бясплатнае харчаванне даецца з моманту іх прыбыцця ў навучальныя ўстановы і да залічэння ў іх.

Пасля сканчэння навучальнай установы пры працаўладкаванні выдаецца адзенне, абутак, мяккі інвентар і абсталяванне з разліку 1140 руб. на чалавека (для тых, хто знаходзіцца на поўным дзяржаўным зябеспячэнні), а таксама грашовую дапамогу на першапачатковыя расходы ў памеры 100 рублёў. У выпадку прызыву выпускнікоў у войска, а таксама рэгістрацыі шлюбу даецца права выдаваць замест пералічанага інвентара і абсталявання грашовую кампенсацыю ў памеры 1140 руб. або пералічваць гэтую суму ў якасці ўкладу на імя выпускніка ў Ашчадным банку СССР.

У перыяд канікул дзеці-сіраты і дзеці, якія засталіся без апекі бацькоў, могуць набыць бясплатныя пуцёўкі ў дамы адпачынку, пансіянаты і прафілакторыі, студэнцкія спартыўна-аздараўленчыя лагеры, а пры наяўнасці медыцынскіх паказанняў — у санаторыі. Акрамя таго, студэнты і навучэнцы могуць праводзіць канікулы ў тых установах або сем ́ях, дзе яны выхоўваліся. Расходы, звязаныя з праездам студэнтаў і навучэнцаў у месцы адпачынку і назад, робяцца за кошт сродкаў, прадугледжаных на ўтрыманне навучальных установ.

Студэнты і навучэнцы штогод маюць права атрымліваць матэрыяльную дапамогу ў памеры да 100 рублёў за кошт стыпендыяль-

**(Працяг на 2 стр.)**

# ІНФАРМАЦЫЙНЫ КАЛЕЙДАСКОП

## НАВУКОВЫЯ СУВЯЗІ

У канцы лістапада 1991 года ў Беластоку адбылася навуковая канферэнцыя, прысвечаная даследаванню славянскіх моваў і літаратур. Яе арганізавала і праводзіла філія Варшаўскага універсітэту ў Беластоку. З дакладамі выступілі польскія, беларускія і расейскія вучоныя — з Варшавы, Лодзі, Санкт-Пецярбурга, Казані, Віцебска, Гродна і іншых навуковых цэнтраў. Ад Гродзенскага універсітэта імя Янкі Купалы прынялі ўдзел супрацоўнікі факультэта беларускай філалогіі і культуры — загадчык кафедры мовазнаўства прафесар П. Сцяцко і загадчык кафедры беларускай літаратуры дацэнт К. Лецка.

Доктар філалагічных навук П. Сцяцко прачытаў даклад на тэму «Беларуска-польскія ўзаемасувязі на лексічным узроўні». Вучоны вызначыў варункі пранікнення запазычаных слоў з польскай мовы ў беларускую і з беларускай у польскую, паказаў неаднолькавую функцыю і ступень актыўнасці запазычанняў у розных стылях беларускай і польскай моваў. Падрабязна разгледжаны ў дакладзе прыметы слоў польскай мовы (фанетычныя, словаўтваральныя і іншыя) і ў адпаведнасці з імі — групы паланізмаў у беларускіх паўднёва-заходніх гаворках і найболей — у народна-дыялектнай мове жыхароў Гродзеншчыны, што знайшло свой адбітак у апублікаваных аўтарам дакладу ранейшых кнігах: «Дыялектны слоўнік. З гаворак Зэльвеншчыны» (1970), «Народная лексіка» (1970). «Народная лексіка і словаўтварэнне» (1972) і «Беларускае народнае словаўтварэнне» (1977).

Кандыдат філалагічных навук К. Лецка выступіў з дакладам на тэму «Верш Янкі Лучыны» «Пышнь відок» у беларускіх перакладах», дзе ўпершыню прааналізаваў беларускія пераклады верша, прысвечанага тэме Каўказу і Беларусі, вызначыў суадносіны рамантычных і рэалістычных тэндэнцыяў у арыгінале і перакладах.

Былі наладжаны цесныя навуковыя сувязі з аддзелам усходнеславянскай філалогіі Беластоцкай філіі Варшаўскага універсітэта і Гродзенскім універсітэтам. Праф. П. Сцяцко прымае ўдзел у стварэнні падручніка па кантрастыўнай граматыцы. Ён запрошаны кансультантам аспірантаў і дактарантаў гэтага універсітэта па праблемах беларускай лінгвістыкі.

## ПРЫГАЖУНІ, НЕ СПІЦЕ Ў ШАПКУ

Калі вы прыгожая дзяўчына і вам споўнілася 18 гадоў, а ў кішэні ёсць 60 рублёў, то перад вамі адкрываюцца спакуслівыя перспектывы. У палацы хімікаў польская фірма «БЕСТ» праводзіць конкурс кандыдатак у манекеншчыцы. Усё астатняе залежыць толькі ад вас!

## Абмяркоўваем праект

**Апублікаваны праект Статута Студэнцкага Саюза Гродзенскага дзяржуніверсітэта імя Янкі Купалы. Нельга сказаць, што гэта зроблена своечасова або са спазненнем, але зроблена правільна, выбар таксама правільны. Мне хочацца ўнесці свае прапановы і дапоўніць праект Статута.**

**С. ГУБЕРНАТАРАЎ,**
**студэнт 4 курса**
**юрыдычнага факультэта**

*Дапаўненні чытайце на 2-й старонцы*

